*І. КОЛАБАВА*

# НУМІЗМАТЫЧНАЯ КАЛЕКЦЫЯ ЛАГОЙСКАГА МУЗЕЯ ТЫШКЕВІЧАЎ

Звестак аб нумізматычнай калекцыі сям'і Тышкевічаў амаль што няма, але на падставе нешматлікага фактычнага матэрыялу, ускосных дадзеных, звязаных з агульным развіццём нумізматычнага руху, можна скласці некаторае ўяўленне аб гэтым зборы.

Асновы навуковай нумізматыкі былі закладзены ў канцы XVIII ст., але, як і ў кожнай навуцы, гэтаму папярэднічаў доўгі перыяд назапашвання фактычнага матэрыялу.

Яшчэ ў сярэдзіне XVI ст. нумізматычнае збіральніцтва стала дастаткова прэстыжным заняткам. У гэты час у палацах еўрапейскіх арыстакратаў налічвалася каля 950 мюнцкабінетаў, дзе выстаўляліся прыватныя манетныя калекцыі [1, с. 83].

Збіральнікі манет паступова выпрацавалі і асноўныя метады нумізматычнага калекцыяніравання. Манеты пачалі падзяляць па тэматычнаму і храналагічнаму прынцыпах, звярталася ўвага на вывучэнне тэхнікі манетнай вытворчасці, метралагічных параметраў манет. Нумізматычнае збіральніцтва паступова распаўсюджваецца не толькі на манеты Антычнасці і Сярэднявечча, але і на грашовыя знакі больш позніх часоў.

Узнікненне навуковай нумізматыкі даследчыкі звязваюць з распрацоўкай гісторыка-геаграфічнага прынцыпу пры сістэматызацыі нумізматычнага матэрыялу.

Калекцыяніраванне манет на тэрыторыі Беларусі звязана з імем Мікалая Радзівіла Чорнага (1515–1565), які пасля вяртання з вандроўкі па Еўропе заснаваў у Нясвіжскім палацы мюнцкабінет («скарбец») і паклаў пачатак вядомага манетна-медалёвага збору.

Даволі хутка збіральніцтва манет стала вельмі папулярным сярод прадстаўнікоў вышэйшых колаў насельніцтва.

Значную нумізматычную калекцыю, якая налічвала 1125 манет, меў Казімір Сапега (1609–1656). Вядомымі калекцыянерамі былі Мікалай Румянцаў (1754–1826), Эмерык фон Гутэн-Чапскі (1828–1896), Іван Паскевіч (1782–1856).

Збіральніцтвам манет займаліся Канстанцін і Яўстах Тышкевічы (1806–1868; 1814–1873). У экспазіцыі іх прыватнага музея ў Лагойску, адкрытага ў 1842 г., была прадстаўлена даволі значная калекцыя манет і медалёў (1140 адзінак), прычым 420 экземпляраў былі адчаканены ў Рэчы Паспалітай [6, с. 174; 3, с. 28].

У далейшым Я. Тышкевіч перадае ў Віленскі музей старажытнасцей калекцыю залатых і срэбраных манет і медалёў [3, с. 79–80].

Нумізматычная калекцыя музея старажытнасцей актыўна папаўнялася за кошт падарункаў і перадачы скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, ад Імператарскай археалагічнай камісіі ў фонды музея паступіла частка скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Гродзеншчыны.

Вядомы беларускі краязнавец Г. Кахаshowскі прыводзіць некаторыя канкрэтныя звесткі аб нумізматычнай калекцыі Віленскага музея: «Нумізматыку, геральдыку, кнігі перадаў У. Сыракомля... Сярод прысланых у музей матэрыялаў былі наканечнікі стрэлаў, каменныя сякеры, праслiцы, акамянеласці, шмат манет, творы мастацтва. Нехта Марцін Капуцкі з Маладзечна даслаў выяўлены ім скарб манет колькасцю каля 100 штук, Міхаіл Тышкевіч перадаў 143 старажытныя манеты. Іх заносілі ў кнігу пярвічнай рэгістрацыі фондаў. Коратка запісваліся толькі асноўныя звесткі аб прадметах. У 1856 г. Віленская археалагічная камісія сваім спецыяльным зваротам прасіла ўсіх зацікаўленых асоб рабіць ахвяраванні для музея старажытнасцей... Нумізматычная калекцыя дасягала 3 тыс. грашовых знакаў» [5, с. 85].

У 1858 г. у нумізматычным зборы музея налічвалася 3247 адзінак захавання, з іх 246 «рускіх манет і медалёў», 698 «літоўскіх і рускіх» [5, с. 86].

У адпаведнасці з каталогам Віленскага музея старажытнасцей за 1885 г. у «отделе И», дэманстраваўшым нумізматычную калекцыю, было прадстаўлена 5118 манет (без уліку дублетаў) і 1308 медалёў. Прыводзіўся і пералік краін, з якіх паходзілі прадстаўленыя манеты: Расія, Рэч Паспалітая, Швецыя, Англія, Францыя, Германія, Грэцыя, Рым, Турцыя, Данія, Італія,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іспанія, Швейцарыя [4, с. 85–89]. У каталогу адсутнічала ўказанне на месцы знаходак асобных манет.

У 1855–1915 гг. у музей было перададзена 78 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Віленскай губерні [2, с. 40]. У рэчышчы рэпрэсіўных мерапрыемстваў, разгарнуўшыхся пасля падаўлення паўстання 1863–64 гг., у музеі была праведзена рэвізія фондаў. У выніку з музея былі вывезены найбольш значныя для беларускай гісторыі музейныя прадметы. Па дадзеных, прыведзеных Д. Грымалаўскайтэ, у 1866 г. у нумізматычным зборы музея налічвалася 8110 адзінак захавання, з іх у 1868 г. у Румянцаўскі музей вывозяцца 5995 адзінак (18 залатых манет, 3948 срэбраных, 1997 медных, 14 бронзавых медалёў, 18 асігнацый) [2, с. 41]. Адсутнасць падрабязнага апісання не дае магчымасці дакладна вызначыць склад гэтага нумізматычнага матэрыялу.

Па каталогу за 1869–1871 гг. у нумізматычны збор музея ўваходзіла 1217 медалёў, 84 залатыя манеты, 3 плацінавыя, каля 4740 іншых манет, а ў перыяд 1899–1911 гг. музей прыняў яшчэ 9 скарбаў [2, с. 41].

У 1915 г. калекцыі Віленскага музея былі вывезены ў Маскву, а пасля 1921 г., за выключэннем археалагічнай, вернуты ў Вільню.

Частка сучаснай экспазіцыі Нацыянальнага музея Літвы адведзена для паказу захаваўшыхся экспанатаў Віленскага музея старажытнасцей. З былой нумізматычнай калекцыі ў зборах музея зараз захоўваюцца скарб і шведскія платы XVII ст. [2, с. 41].

Гісторыя нумізматычнай калекцыі сям'і Тышкевічаў цесна звязана з гісторыяй краіны. У свой час яна была прадстаўлена ў экспазіцыі прыватнага Лагойскага музея, а затым стала асновай будучага нумізматычнага збору Віленскага музея старажытнасцей, падзяліўшы з ім няпросты лёс.

## Літаратура

1. Беляков, А. С. Нумизматика / А. С. Беляков // Введение в специальные исторические дисциплины / А. С. Беляков. – М., 1990.

2. Грималаускайте, Д. Собрание нумизматики Виленского музея древностей / Д. Грималаускайте // Междунар. нумизматическая конф., посвященная 150-летию Национального музея Литвы (Вильнюс, 26–28 апреля 2006 г.) / Национальный музей Литвы. – Вильнюс, 2006.

3. Гужалоўскі, А. А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мн., 2001.

4. Каталог предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке. – 2-е изд. – Вільна, 1885.

5. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мн., 1984.

6. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Мн., 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ